# НЕМЦЫ ПРЫЙШЛІ…

## Успаміны Веры Андрэеўны Шымавалос, былой жыхаркі вёскі Каленікі

Дзесьці праз тыдзень пасля пачатку вайны, па Каленіках разнёсся палахлівы дзіцячы крык:

- Немцы ідуць! Немцы ідуць!

Малыя тут жа рассыпаліся, бы гарох, па хатах. Вёска стаілася. І ў гэтай нязвыклай, бы мёртвай цішыні жудасна загрукацелі па брукоўцы чаравікі фашыстаў (яны былі чамусьці на шыпах). Стаяла спёка, і захопнікі ішлі, закасаўшы рукавы аж па локці. Мы з братам цікавалі на вуліцу з-за фіранак, і сам выгляд фашыстаў наганяў страху: высокія, дзябёлыя і ўсе чамусьці рыжыя да чырвані, нават рукі - у чырвоным рабацінні. Дарослыя прыгадвалі, што гэта нейкія лютаране. Цягнуліся фурманкі, запрэжаныя невысокімі прысадзістымі коньмі з кароткімі тоўстымі нагамі (казалі, яны бельгійскай пароды). Па гасцінцы, уздоўж вёскі, у напрамку Ваўкавыска ехалі веласіпедысты, паўзлі шырокія няўклюдныя танкі.



***В. А. Шымавалос.***

Фашысты вялі сябе нахабна, гаспадарылі на пругменях. Патрабавалі яйкі. Нішчылі курэй: кіне каскай, падаб'е, возьме галаву ў два пальцы, раскруціць - і тулава курыцы ляціць у траву. Тут жа, на вогнішчы, курэй тых варылі.

- Бач, як навучыліся, гады, у чужых землях ваюючы, - са злосцю сказаў бацька.

На нашым пругмені спыніліся на адпачынак каля дваццаці фашыстаў. Раптам мы згледзелі, што яны вывелі з хлява кабылу.

- Забяруць! - войкнула маці і, не паспелі мы сцяміць, выбегла з хаты. Бацька - за ёю: «Вярніся!» Мы ж утрапянелі ля акна: фашыст наставіў на маці аўтамат. На шчасце, абыйшлося. Немцы нешта «пагергеталі» па-свойму, але маці не чапалі. Не забралі і кабылу.

Тыя, першыя фашысты, пакінулі вёску праз некалькі гадзін. А ўсё новыя грукацелі і грукацелі чаравікамі па брукоўцы аж да заўтрашняга абеду.

І пачалася страшная сваёй невядомасцю акупацыя. Мне ўрэзаўся ў памяць эпізод, які ўскалыхнуў усю вёску. Двое чырвонаармейцаў-хлапчукі яшчэ, год па дзевятнаццаць - дабраліся ў вёску параненыя. Хаваліся за гумнамі, у кар'еры. Мая маці занесла ім цывільную вопратку

сына. А мною пасылала хлопцам харч. Яны расказалі, што родам з Расіі, успаміналі родных, блізкіх, распытвалі, як мы тут жылі да вайны.

Марылі: «Вось падлечымся, акрыяем і будзем прабірацца да сваіх». Але немцы даведаліся пра чырвонаармейцаў. Іх вялі пад дуламі аўтаматаў праз вёску. Адзін, вышэйшы, ціха прамовіў, не ўздымаючы галавы: «Прощайте»... Казалі потым, хлопцаў расстралялі недзе ля Хмеліска.

Я плакала так, што апухла ад слёз. Гэта быў першы рубец на маім сэрцы, які пакінула вайна. А колькі іх з'явілася потым...

Наша вёсачка Каленікі невялікая, усяго 31 хата. І ў кожную сурова заглянула вайна. У мяне было двое старэйшых братоў. Брата Івана, як і дзядзьку Яфрэма Саланевіча ды Івана Навумовіча, фашысты забралі ў Беластоцкую турму. Дамоў яны не вярнуліся, былі закатаваны ... Загінуў на фронце Георгій Навумовіч, пакінуўшы на руках жонкі васьмёра малых дзяцей. Не вярнуўся да маленькай дачушкі Іосіф Сак, навек засталіся на той праклятай вайне Мікалай Улейчык, Васіль Маслоўскі. Мой брат Аляксандр вярнуўся з фронту паранены, а Міхаіл Сяўко - інвалідам, смерці ў твар не раз глядзелі на фронце Аляксандр Саланевіч і Аляксандр Улейчык.

Моладзь фашысты забіралі парабкаваць у Германію. Ніне Карпач было ўсяго 17 год, калі яна трапіла на чужыну, нямногім больш - Ніне Навумовіч, Валодзю Улейчыку, Марыі Маслоўскай, Іосіфу Навумовічу, а Ганну і Панаса Саланевічаў забралі з іх паўтарагадовым сынам...

Кожны дзень вёсачка жыла ў страху. Даходзілі чуткі, што немцы расправіліся з вялікаю сям'ёю ў Лявонавічах, што расстралялі дзве сям'і на лясных хутарах каля Жукевічаў - казалі, за сувязь з партызанамі.

Фашысты прымушалі жанчын вязаць для свае арміі цёплыя шкарпэткі, рукавіцы. Здавалі людзі старасту малако і мяса. Сабе калолі свінчо ўпотайкі - барані Божа, каб даведаліся немцы, бо расстраляюць. Помню, калолі мы ноччу, у прыбудоўцы, і свінчо віскнула. Прыбег, увесь збялеўшы, сусед, наш сваяк, і - да бацькі: «Ты што, Андрэй, усю сям'ю хочаш загубіць?! Завязаў бы на лыч вяроўку - само задыхнулася б». Смалілі ў хаце, завесіўшы вокны кажухамі.Пасля ледзь адмылі - адчысцілі сцены і столь.

Усе дні праходзілі ў трывозе. Але неяк перад летам 44-га людзі пачалі пагаворваць: немцам зламалі - такі хрыбет, хутка савецкая армія і нас вызваліць Так чакалі гэтага дня!

Запісала Марыя Драпеза, в. Пархімаўцы,
2001 год.